# Максім Багдановіч і яго творы на мастацкіх палотнах



Партрэт М. Багдановіча. Мастак В. Волкаў



У кожнага народа ёсць знакавыя асобы, якімі ён асабліва ганарыцца. Не сталі выключэннем і беларусы. Сярод шматлікіх прадстаўнікоў нашай Радзімы, чые імёны залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю не толькі айчыннай, але і сусветнай культуры, вылучаецца класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч. Самыя першыя крокі па замацаванні памяці паэта сродкамі жывапісу былі зроблены ў 1927 годзе – праз 10 гадоў пасля яго смерці. Створаны вядомым майстрам пэндзля Валянцінам Волкавым партрэт падкупляе лірычнасцю, засяроджанасцю на багатым унутраным свеце Максіма. Увагу гледачоў прыцягвае, перш за ўсё, адухоўлены твар і рука, якая трымае кнігу. Гэтыя выразныя штрыхі лепш за ўсё падкрэсліваюць, што перад намі партрэт творчага чалавека, Паэта, чые вершы і сёння хвалююць чытачоў. Асоба Максіма Багдановіча, як і яго творы, заўсёды выклікалі цікавасць і ў іншых прадстаўнікоў выяўленчага мастацтва. Блізкая і зразумелая не аднаму пакаленню беларусаў творчасць «песняра чыстае красы» напоўнена агульначалавечымі каштоўнасцямі, вартасць якіх з цягам гадоў не мінае. «Загадка Багдановіча»... Словазлучэнне, якое найчасцей выкарыстоўваецца ў дачыненні да літаратурнай спадчыны паэта, дарэчнае і да твораў, прысвечаных Максіму Багдановічу, хоць кожны з мастакоў па-свойму ўбачыў і адлюстраваў вобраз паэта і сюжэты яго вершаў. Найбольш адметныя з такіх карцін прапануем на старонках часопіса.



Партрэт М. Багдановіча. Мастак В. Альшэўскі



Уступ. Мастак Э. Агуновіч



Памяці М. Багдановіча. Апошні санет. Мастак У. Пракапцоў



Памяць аб М. Багдановічу. Мастак Ю. Гаўрын





Максім Багдановіч. Мастак Ю. Хілько



Вераніка і Максім. Мастак А. Марачкін



Партрэт Максіма Багдановіча. Мастак Р. Кудрэвіч



Ціха ўсё было на небе, зямлі і на сэрцы... Мастак Г. Лойка



Ад родных ніў, ад роднай хаты... Мастак М. Апіёк



Вянок Максіму Багдановічу. Мастак М. Цудзік



Партрэт М. Багдановіча. Мастак А. Лапіцкая



Марыя Апанасаўна Багдановіч з сынам Максімам. Мастак В. Маркавец

Падрыхтаваў Аляксандр Самовіч